# Абноўленую Канстытуцыю да 1 верасня накіруюць Прэзідэнту

**Праект новага Асноўнага Закона ў хуткім часе перададуць на разгляд кіраўніку краіны. Пра гэта паведаміў старшыня Канстытуцыйнага суда, старшыня Канстытуцыйнай камісіі Пётр МІКЛАШЭВІЧ, перадае БелТА.**

«Мы сёння прынялі дакумент. Зараз пройдзе рэдакцыйная вычытка, і ва ўстаноўленым парадку мы накіруем гэты дакумент Прэзідэнту. Гэта значыць да 1 верасня, — канстатаваў ён. — Далей мы чакаем, што пройдзе пасяджэнне Канстытуцыйнай камісіі ўжо з удзелам кіраўніка дзяржавы. Будуць разглядацца канкрэтна тыя прапановы, якія прадстаўлены Канстытуцыйнай камісіяй, шэраг спрэчных пытанняў, звязаных з фарміраваннем Усебеларускага народнага сходу, смяротным пакараннем, правамі працоўных калектываў вылучаць кандыдатаў у дэпутаты. Гэтыя пытанні таксама будуць прадметам разгляду на пасяджэнні Канстытуцыйнай камісіі з удзелам Прэзідэнта».

Як распавёў Пётр Міклашэвіч, можна канстатаваць, што Канстытуцыйная камісія прапануе змяніць 53 артыкулы Канстытуцыі, увесці 14 новых артыкулаў і 2 артыкулы выключыць. Камісія рэкамендуе захаваць прэзідэнцкую форму праўлення, правесці пераразмеркаванне паўнамоцтваў паміж Прэзідэнтам, парламентам і ўрадам.

«Прапануецца замацаваць і ўстанавіць канстытуцыйны статус Усебеларускага народнага сходу — гэта новы орган у сістэме дзяржаўнай улады. Тут задача была знайсці той аптымальны варыянт, каб орган з дарадчага стаў канстытуцыйна-ўладным. З іншага боку, Усебеларускі народны сход не павінен парушыць існуючую сістэму ўлады, а павінен стаць стабілізуючым органам для ўстойлівасці ўсёй сістэмы дзяржаўнай улады, найважнейшым паўнамоцтвам яго было якраз вырашэнне стратэгічных пытанняў далейшага развіцця нашай краіны».

Пётр Міклашэвіч паведаміў, што ішла шырокая дыскусія наконт таго, ці пакінуць ранейшы парадак фарміравання Усебеларускага народнага сходу, бо прапаноўваліся іншыя варыянты. Ён дадаў: «З аднаго боку, гэты орган павінен быць з шырокім прадстаўніцтвам народа. Сама назва пра гэта кажа — Усебеларускі народны сход. З другога боку, павінен быць пільны адбор дэлегатаў УНС, паколькі ім прыйдзецца вырашаць канстытуцыйна значныя пытанні развіцця нашай краіны, развіцця грамадства і дзяржавы».

Як адзначыла **старшыня Пастаяннай камісіі па заканадаўстве Палаты прадстаўнікоў, член Канстытуцыйнай камісіі Святлана ЛЮБЕЦКАЯ,** у выніку разгляду розных меркаванняў неабходна выпрацаваць універсальную формулу: «Якое будзе прадстаўніцтва, якога ўзроўню. Сапраўды трэба казаць пра тое, каб усё насельніцтва было прадстаўлена, каб ахоплены былі як раёны з невялікай колькасцю насельніцтва, так і той жа горад Мінск. Прычым прадстаўлены самыя розныя слаі грамадства, самыя розныя сацыяльныя зрэзы, і гэта таксама трэба максімальна ўлічваць».

Таксама, паводле слоў Пятра Міклашэвіча, прапануецца канкрэтызаваць канстытуцыйныя асновы выбарчай сістэмы — падняць статус Цэнтральнай выбарчай камісіі, стварыць умовы для поўнай рэалізацыі выбарчых правоў нашых грамадзян. Акрамя таго, прапануецца ўзмацніць сацыяльныя гарантыі шматдзетных сем'яў, інвалідаў, пенсіянераў. «Мяркуецца ўвесці новы праваабарончы інстытут — упаўнаважанага па правах чалавека, а таксама пашырыць правы нашых грамадзян на непасрэдны зварот у Канстытуцыйны суд, гэта значыць на падачу канстытуцыйнай скаргі непасрэдна ў КС», — падкрэсліў Пётр Міклашэвіч.

Ва ўрадзе

## ЭКАНОМІКА: РОСТ ЯКАСНЫ

**Прэм'ер-міністр Раман ГАЛОЎЧАНКА падвёў вынікі сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны ў першым паўгоддзі падчас пасяджэння Савета Міністраў, перадае карэспандэнт БелТА.**

«З шасці асноўных паказчыкаў работы ўрада і Нацыянальнага банка ў першым паўгоддзі выкананы чатыры. Выніковы паказчык працы ўсёй эканомікі — рэальныя наяўныя даходы насельніцтва — за студзень—май павялічыўся на 3,5 %, што вышэй за прагноз. На працягу паўгоддзя ўстойліва расла заработная плата: у чэрвені выйшлі на ўзровень больш Br1400, рост у рэальным выражэнні на 5,6 %», — сказаў Раман Галоўчанка.

Паводле яго слоў, паступальна вырашаецца задача павышэння даходаў у бюджэтнай сферы, у першую чаргу гэта датычыцца педагагічных работнікаў і прадстаўнікоў аховы здароўя. «Мэтавы арыенцір выкананы: сярэднія заробкі бюджэтнікаў з сярэднім па краіне склалі больш за 81 %. У адпаведнасці з рашэннем урада з 1 жніўня, на 1,5 % павялічана базавая стаўка аплаты працы бюджэтнікаў. Дзякуючы стварэнню ўмоў па забеспячэнню ўстойлівай работы рэальнага сектара эканомікі не дапушчана росту беспрацоўя», — адзначыў прэм'ер-міністр.

Раман Галоўчанка звярнуў увагу на тое, што ў знешнім гандлі захоўваецца як збалансаванасць, так і высокія тэмпы росту экспарту. «Знешнегандлёвае сальда за шэсць месяцаў у плюсе — $1,73 млрд. Своечасова і ў поўным аб'ёме забяспечаны выплаты па знешніх і ўнутраных абавязацельствах, у прагнозных параметрах захаваны золатавалютныя рэзервы», — дадаў ён.

«У цэлым вынікі працы за мінулы перыяд сведчаць аб якасным росце эканомікі: тэмп росту ВУП — 103,3 %», — рэзюмаваў прэм'ер-міністр.

Акцэнты

## «З вамі — стабільнасць, развіццё, а галоўнае — народ!»

**Што пішуць звычайныя людзі — беларусы і замежнікі — кіраўніку дзяржавы пасля прагляду «Вялікай размовы».**

***

Пачну з таго, што я звычайная маці двух дачок, мне 30 гадоў. Паглядзела «Вялікую размову». Я вельмі далёкая ад пытанняў палітыкі, але тое, што адбываецца апошнім часам у нашай краіне, на яе граніцах, і за яе межамі, не можа не хваляваць. Гэта страшна. Не магу зразумець і не разумею тых людзей, якія скардзяцца на сваё «беднае» жыццё, маючы тры асабістыя аўто, маючы дамы, лецішчы, кватэры, слухаць, як у нас усё дрэнна.

Я не хачу пісаць вам гучных слоў, а хочацца сказаць проста і ад усяго сэрца: Вам цяпер вельмі цяжка, цяпер усё вакол супраць нашай краіны, супраць народа, супраць Вас. Але асабіста хачу выказаць Вам вялікую падзяку за тое, што змаглі захаваць у нас мір і спакой, дзякуй Вам, што мае дзяўчынкі жывуць у спакойнай краіне, у якой можна вучыцца, займацца спортам, развівацца і спакойна гуляць на вуліцы. Хачу пажадаць Вам моцнага здароўя, стойкасці і мэтанакіраванасці! І вельмі хочацца, каб і мае дзеці, ужо будучы дарослымі, жылі ціха і спакойна. Я за сябе не баюся, баюся за іх, за іх будучыню.

Здароўя Вам і Вашай сям'і, дабрабыту і цяпла, міру і працвітання!

*Анастасія Юхо, Капыль.*

***

Шчыра ўдзячны Вам за ўсё, што Вы зрабілі для нашай Радзімы і для нас — беларусаў, і не пакінулі нас на разарванне ў цяжкі перыяд! Ад усёй душы жадаю Вам моцнага здароўя, жыццёвых сіл і даўгалецця! Вы нам вельмі патрэбныя!

*Церашчук Ігар Віктаравіч, Мінск.*

***

Дазвольце Вам сардэчна падзякаваць за тое, што Вы адстойваеце інтарэсы сваёй дзяржавы і свайго народа! Прайшоў роўна год з тых самых часоў, калі Захад пачаў адкрытую вайну супраць Беларусі. Было вельмі прыемна глядзець на Вас, на Вашу імгненную рэакцыю, калі тыя спрабавалі разгайдаць сітуацыю ў краіне. А Ваш выхад на мітынгу 16 жніўня зрабіў каласальны эфект. Вы — сапраўдны мужык і самы лепшы прэзідэнт!

Я не ведаю іншага кіраўніка дзяржавы, такога ж моцнага, незалежнага, які б змог пабудаваць сапраўды цудоўную Рэспубліку. З вамі — стабільнасць, з вамі — развіццё, а галоўнае — народ. Але народ не толькі ў Беларусі, але і ў Расіі.

Не ўсе студэнты слепа ідуць па закліку разбуральнікаў. Я — студэнт, мы, студэнты (гісторыкі), многае разумеем. І ў нас у краіне ёсць тыя, з якімі і «на адным кіламетры не прысесці», як кажуць у народзе. Нашы краіны павінны быць разам, гэта — галоўная мара. Мы Вас падтрымліваем і моцна, па-мужчынску, ціснем руку!

*Катрушэнкаў Марк Уладзіміравіч, Масква.*

***

Мне 12 гадоў. Жыву на Урале, у Чэлябінску. Захоплены Вамі як прэзідэнтам. У панядзелак 8 гадзін слухаў Вашу канферэнцыю і ва ўсім я згодны з Вамі. Вы — сапраўдны, мужны, смелы, прыстойны, сумленны чалавек, патрыёт Беларусі. Мой горад вельмі далёка ад Мінска. Але я вырасту, зараблю грошай і абавязкова прыеду ў Мінск і Брэсцкую крэпасць, дзе загінулі мае прадзеды. Здароўя Вам і Вашым блізкім і доўгіх, доўгіх гадоў жыцця.

*Кудрашоў Рыгор Уладзіміравіч, Урал, г. Чэлябінск.*

***

Я як беларуска па крыві захапляюся Вамі, Вы сапраўдны Прэзідэнт, смелы і дасведчаны. Вельмі шкада, што на Вас ідзе атака з Захаду, і абвінавачваюць вас у сваіх жа брудных справах. Беларусі вельмі пашанцавала з Прэзідэнтам, жадаю Вам усіх перамагчы і заставацца на пасадзе Прэзідэнта яшчэ вельмі шмат гадоў. Вы малайчына.

*Ірына Яўгенаўна Маер, Казахстан, г. Паўладар.*

***

Хачу Вам пажадаць моцнага здароўя, вытрымкі і цярпення ў адносінах да нас, украінцаў. Такая ўжо ў нас карма, што краінай кіруюць пяць працэнтаў і за акіянам выконваюцца рашэнні, якія разбураюць краіну, прамысловасць і саму дзяржаву, Вы і самі гэта ведаеце.

Паглядзеў на Вашу прэс-канферэнцыю. Трымайцеся, не паддавайцеся на правакацыі. Верым, шчыра паважаем, давяраем, беражыце сябе.

*Яфіменка А. В., Украіна, Харкаў.*

Блізкая ўлада

## ПАЧУЦЬ «ГЛЫБІНКУ»

**Просьбы падтрымаць ініцыятывы па развіцці сельгасбізнесу і надзеі на дапамогу ў вырашэнні сямейных праблем — гэтыя і іншыя хвалюючыя пытанні і прапановы адрасавалі жыхары Акцябрскага раёна старшыні Гомельскага аблвыканкама Генадзю САЛАЎЮ. Кіраўнік рэгіёна правёў у райцэнтры прамую тэлефонную лінію і прыём грамадзян.**

Было прынята рашэнне адзін з тэлефонных званкоў, агучаных жыхаркай райцэнтра, разгледзець адразу, з выездам на месца. Увага — да трох аднолькавых двухпавярховых чатырохкватэрных дамоў па вуліцы Савецкая. Па словах заяўніцы, у адным з іх на другі паверх не праведзена вада, ацяпленне — пячное. Суседзі знізу не даюць дазволу правесці камунікацыі... Хвалюючую праблему дэталёва прапрацаваць і прапанаваць магчымыя варыянты яе



Фота БелТА.

вырашэння — такое даручэнне даў кіраўнік рэгіёна.

Раённым службам даручана даць тлумачэнні па звароце шматдзетнага бацькі, жыхара гарадскога пасёлка Акцябрскі. Мужчына прасіў разабрацца ў сітуацыі, у якой апынулася яго сям'я. З дапамогі па дзіця, што атрымлівае жонка заяўніка, утрымліваюцца заліншія сродкі. Прычына — атрымальніца дапамогі ў дэкрэтным водпуску не падала заяву на прыпыненне прадпрымальніцкай дзейнасці. Заяўнік падзяліўся і іншымі перажываннямі: яго жонка пасля дэкрэтнага павінна выйсці на асноўнае месца працы — Акцябрскі тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва.

— Ёсць інфармацыя, што работу цэнтра закрануць змены, аптымізацыя кадраў. Перажываю, што жонку скароцяць, яна застанецца без работы, — растлумачыў заяўнік. Па агучаных пытаннях сям'я атрымае падрабязныя рэкамендацыі, запэўніў Генадзь Салавей.

Да губернатара са сваёй праблемай звярнулася супрацоўніца крамы ў вёсцы Новая Дуброва Акцябрскага раёна. Жанчына распавяла, што ніяк не можа спагнаць доўг — больш за 780 долараў. Даўжніца — маці траіх дзяцей — раней брала таварныя крэдыты і заўсёды іх пагашала, цяпер не працуе і вярнуць грошы, кажа, не можа. Варыянты вырашэння праблемы будуць разглядацца адказныя службы.

Да кіраўніка рэгіёна звярнуліся таксама жыхары райцэнтра з прапановай развіцця фермерскай гаспадаркі. Заяўнікі маюць намер развіваць адпаведную дзейнасць у аграгарадку Парэчча, а для гэтага ім патрэбныя дадатковыя тэрыторыі.

— Мы займаемся раслінаводствам, вырошчваем гародніну, бульбу. Хочам займацца жывёлагадоўляй — малаком, мясам. Гэта прыбытковы перспектыўны напрамак, — упэўнены фермеры.

Генадзь Салавей прыняў рашэнне наведаць гаспадарку і азнаёміцца, як наладжана работа на месцы.

— Калі вы плануеце развіваць жывёлагадоўлю, з землямі дапаможам. Складайце бізнес-план, вывучайце перадавы вопыт, новыя тэхналогіі, — заклікаў фермераў да кантрэтных крокаў старшыня аблвыканкама.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**